# СА СВЯТАМ ПЕРАМОГІ!

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1985

8

МАЯ

СЕРАДА

№ 16-17 (1466-1467)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

Беларускі універсітэт

## ТЭЛЕТАЙП

«УЧОРА - СЁННЯ - ЗАЎТРА»

### СЕМІНАР АКТЫВУ ЗЯМЛЯЦТВАЎ

замежных навучэнцаў, прысвечаны 40-годдзю Перамогі, прайшоў нядаўна ў Раўбічах. У яго рабоце прынялі ўдзел прадстаўнікі студэнцкіх зямляцтваў 40 краін Еўропы, Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі — студэнты БДУ імя У. І. Леніна, БПІ, тэхналагічнага і медыцынскага інстытутаў, а таксама іншых навучальных устаноў Мінска.

А. ЗЯНКЕВІЧ,
студэнтка факультэта журналістыкі.

### У РАМКАХ ТЫДНЯ

маладога лектара адбылася традыцыйная студэнцкая навуковая канферэнцыя, прысвечаная 115-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна.

З уступным словам выступіў прарэктар па міжнародных сувязях А. В. Шарапа.

З дакладам «Ленінскае вучэнне аб абароне сацыялістычнай Айчыны і яго значэнне для Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне» пасяджэнне адкрыла студэнтка III курса мехмата А. Мароз. На канферэнцыі было заслухана 10 дакладаў па пытаннях ідэалагічнай барацьбы і знешнепалітычнай дзейнасці КПСС, па эканамічнай і атэістычнай праблематыцы. Быў адзначаны высокі ўзровень даклада студэнткі III курса мехмата А. Рыхловай на тэму «Ідэалагічная барацьба і моладзь».

А. ГРЫЦАНАЎ,
кіраўнік школы маладога лектара.

### УКАЗАМ

Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР вялікая група савецкіх спартсменаў за высокія спартыўныя рэзультаты ўзнагароджана ордэнамі і медалямі. Сярод узнагароджаных ордэнам «Знак Пашаны» — заслужаны майстар спорту СССР, студэнтка факультэта журналістыкі Галіна Савіцкая, медалём «За працоўную адзнаку» — заслужаны майстар спорту СССР, студэнт юрыдычнага факультэта Камандар Маджыдаў.

У. АБРАМОВІЧ.

# ПАКЛОН ТАБЕ, САЛДАТ ПЕРАМОГІ!

САЛДАТЫ АЙЧЫНЫ. Гэта іх сілай, мужнасцю, самаадданасцю і вялікай любоўю да Радзімы была атрымана Перамога над ворагам. «Савецкі салдат умеў смела глядзець у вочы смяротнай небяспецы, праявіўшы пры гэтым баявую доблесць і гераізм. Няма мяжы велічы яго працоўнага подзвігу пасля вайны», — так пранікнёна пісаў маршал Савецкага Саюза Г. К. Жукаў, прысвяціўшы сваю кнігу Салдатам Перамогі.

1418 дзён і начэй неймаверных выпрабаванняў выпала на іх долю. Тысячы жорсткіх сутычак з ненавісным ворагам, цяжкасці і нягоды франтавых будняў, напоўненых пастаяннай небяспекай і трывогай. Але іх асабістыя клопаты, іх лёсы зліліся ў адно — у лёс сваёй Радзімы. І калі над павергнутым рэйхстагам узвіўся чырвоны сцяг, узняты рукамі салдат Айчыны, у гэтым палотнішчы зліліся ў адно сцягі ўсіх часцей і злучэнняў арміі і флоту, партызанскіх атрадаў. Яно ўвабрала ў сябе беспрыкладны гераізм, доблесць і мужнасць байцоў і камандзіраў, закавала цеплыню рук мільёнаў людзей, якія самаадданa працавалі ў тыле, набліжалі да нас Свята Перамогі. У ім — часцінка душы кожнага савецкага патрыёта, воіна і працаўніка.

Нізкі паклон вам! Гонар і слава, найвялікшая ўдзячнасць за ваш ратны і працоўны подзвіг! Дзякуй вам за наш мірны сённяшні дзень, за вялікую работу па ваенна-патрыятычнаму выхаванню.

Дзень Перамогі. Ён увянчаў беспрыкладны гераічны подзвіг савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. І святло гэтай Перамогі не пагасне ў вяках. Ёй мы абавязаны сваім жыццём, мірным небам над нашай зямлёй, шчасцем будаваць камунізм. Праз гады і праз стагоддзі народ ніколі не забудзе імёны Салдат Айчыны, якія дарагой цаной здабылі гэту Перамогу.

Моцнага здароўя вам, дарагія ветэраны Вялікай Айчыннай, доўгіх гадоў жыцця, поспехаў, невычэрпнага натхнення ў плённай рабоце па патрыятычнаму выхаванню моладзі!

З Днём Перамогі, таварышы!

РЭКТАРАТ
ПАРТКОМ
КАМІТЭТ КАМСАМОЛА
ПРАФСАЮЗНЫЯ КАМІТЭТЫ

Гады сплываюць, нібы поўні,
Усё далей ад нас вайна,
Ды ўспамінам сэрца поўніць
І зноў чарговая вясна
Такой жа вось — у сорак пятым —
Яна была на ўсёй зямлі,
Калі савецкія салдаты
На захад упэўнена ішлі.
Іх сустракалі — вызваленцаў —
Як дарагіх гасцей сваіх
Палякі, чэхі, венгры, немцы...
Быў непаўторны гэты міг.
Ён застанецца назаўсёды
Ва ўдзячнай памяці людзей,
Як помнік вечнае свабоды,
Як сімвал ленінскіх ідэй.




# КЛЯНЁМСЯ!

НАД НАШАЙ Радзімай мірнае неба. У цішы і спакоі будуюцца дамы, расце хлеб, смяюцца дзеці, вучымся мы, студэнты. Сорак гадоў назад адгрымелі апошнія залпы вайны. Сорак гадоў назад савецкія воіны ў жорсткай барацьбе з ворагам прынеслі народам мір. Вялікай цаной заплаціла Радзіма за гэтую Перамогу. Глядзіш сёння на ветэранаў Вялікай Айчыннай і думаеш, колькі патрэбна было мець мужнасці, сілы, адвагі, каб у неймаверна цяжкіх умовах выстаяць, вытрымаць, перамагчы. Ветэраны Вялікай Айчыннай вайны! Вы — наш гонар і наша слава. Кожны раз, калі вы прыходзіце ў студэнцкую аўдыторыю, кожны раз, калі вы пачынаеце свой расказ аб баях, баявых сябрах, міжволі думаеш: вам было ў той час прыкладна столькі, колькі зараз нам — на дваццаць. І тады пытаеш у сябе: «А я? Я змог бы так?» Змог бы! Не, гэта зусім не пахвальба. Так яно ёсць на самай справе. Ваша жыццё вучыць нас гэтаму. Кожная наша з вамі сустрэча — экзамен, дзе на пытанні жыццёвых білетаў адказваем мы, дзе вы вучыце нас тым складаным законам і формулам, якіх не знойдзеш ні ў адным падручніку, ні ў адным дапаможніку — вы вучыце нас любіць Радзіму, самаадданa абараняць яе цішыню. Дзякуй вам за гэту навуку! Дзякуй вам за дабрату і шчодрасць! Дзякуй вам за вашу нястомную працу — вы і сёння ў страі будаўнікоў камунізму і барацьбітоў за мір! Мы, моладзь 80-х, нязменна будзем працягваць вашы слаўныя традыцыі. Мы клянёмся вам, што заўсёды, калі спатрэбіцца, станем на абарону сваёй Радзімы!

ПА ДАРУЧЭННЮ КАМСАМОЛЬЦАЎ І МОЛАДЗІ — КАМІТЭТ КАМСАМОЛА УНІВЕРСІТЭТА.



40 ГАДОЎ прайшло з таго часу, калі савецкі народ пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі ўпісаў у гісторыю сацыялістычнай дзяржавы адну з самых яркіх і бліскучых старонак — Перамогу ў вайне супраць фашысцкай Германіі і яе саюзнікаў.

Развязаная супраць СССР германскім фашызмам — ударнай сілай сусветнага імперыялізму — гэтая вайна была самай цяжкай. Тысяча чатырыста васемнаццаць дзён і начэй савецкія людзі вялі мужную барацьбу з небяспечным і моцным ворагам. У час нападу на нашу краіну ўзброеныя сілы фашысцкай Германіі былі самымі моцнымі ў капіталістычным свеце па сваёй колькасці, узбраенню і баявому вопыту.

На досвітку 22 чэрвеня 1941 года без аб'яўлення вайны гітлераўскія полчышчы ўварваліся на тэрыторыю Савецкай дзяржавы. Савецкі народ і яго Узброеныя Сілы былі вымушаны ўступіць у смяротную схватку з ворагам. Пачалася Вялікая Айчынная вайна Савецкага Саюза.

Ва ўмовах смяротнай небяспекі, якая навісла над нашай краінай, Камуністычная партыя і Савецкі ўрад заклікалі савецкіх людзей для адпору ворагу. У цяжкіх умовах пачатку вайны былі прыняты меры, каб умацаваць нашу армію, перабудаваць эканоміку на ваенны лад, ператварыць краіну ў адзіны баявы лагер.

Выхаваныя на вялікіх ленінскіх ідэях аб абароне сацыялістычнай Айчыны, гераічна змагаліся з ворагам чырвонаармейцы і камандзіры. Як непаўторны ўзор патрыятызму савецкіх воінаў увайшла ў гісторыю абарона Брэсцкай крэпасці. Аднак спыніць гітлераўскія войскі не ўдалося. Выкарыстоўваючы фактар нечаканасці і іншыя часовыя перавагі, вораг глыбока прасунуўся на тэрыторыю нашай краіны.

Камуністычная партыя і Савецкі ўрад прынялі надзвычайныя меры па мабілізацыі ўсіх рэсурсаў дзяржавы для разгрому ворага і выгнання яго з савецкай зямлі. Гераічная абарона Ленінграда, Кіева, Адэсы, Севастопаля, Смаленская бітва садзейнічалі зрыву нямецкага плана «маланкавай» вайны — хуткага разгрому Савецкай дзяржавы. Выключную стойкасць і масавы гераізм праявілі войскі Чырвонай Арміі, жыхары горада ў абарончых бітвах пад Масквой. Навечна ўвайшоў у гісторыю бессмяротны подзвіг панфілаўцаў і многіх тысяч іншых герояў.

Стойкая абарона на подступах да сталіцы нашай Радзімы дазволіла падрыхтаваць і ажыццявіць контрнаступленне на заходнім стратэгічным напрамку. Паражэнне фашысцкіх войск пад Масквой і наступленне Савецкай Арміі зімой 1941 — 1942 гг. мелі вялікае ваенна-палітычнае значэнне. Быў канчаткова разгромлены план «бліцкрыга», развенчана легенда аб «непераможнасці» гітлераўскай арміі, пакладзены пачатак карэннаму павароту ў ходзе вайны.

Аднак адсутнасць другога фронта ў Еўропе дала магчымасць нямецка-фашысцкаму камандаванню нарасціць свае сілы на ўсходнім фронце. Летам 1942 года ваеннае становішча Савецкага Саюза было цяжкім і небяспечным. Немцы захапілі Крым, Кубань, выйшлі да Волгі, пранiклі на Паўночны Каўказ. Ленінград быў ахоплены кальцом блакады. 17 ліпеня гітлераўскія войскі пачалі наступленне на сталінградскім напрамку. Абарончыя баі за Сталінград працягваліся да сярэдзіны лістапада 1942 года — канца першага перыяду Вялікай Айчыннай вайны — самага цяжкага для савецкага народа і яго Узброеных Сіл.

Але гераічнымі дзеяннямі на фронце і працоўнымі подзвігамі ў тыле савецкі народ к канцу 1942 года стварыў умовы для карэннага пераломму. Пераможна завершаная ў пачатку лютага 1943 года Сталінградская бітва з'явілася рашаючым этапам у дасягненні важнейшай ваенна-палітычнай мэты — карэннага пералому ў ходзе вайны і пачатку масавага выгнання захопнікаў з савецкай зямлі.

У сваю чаргу нямецка-фашысцкае камандаванне, імкнучыся любой цаной прадухіліць распад фашысцкага блоку і вярнуць стратэгічную ініцыятыву, вырашыла правесці летам 1943 года вялікую наступальную аперацыю ў раёне Курскага выступа. У ходзе жорсткіх баёў савецкія войскі выгналі ворага і 12 ліпеня перайшлі ў контрнаступленне. Гістарычная перамога Чырвонай Арміі пад Курскам завяршыла карэнны пералом у ходзе вайны, мела вялікае міжнароднае значэнне.

Вялікую дапамогу ў разгроме ворага аказваў савецкі тыл. Узмацнялі ўдары па ворагу народныя мсціўцы — партызаны і падпольшчыкі.

У трэці перыяд вайны — са студзеня 1944 года па 9 мая 1945 года — Савецкія Узброеныя Сілы выгналі варожыя войскі за межы СССР, вызвалілі ад акупантаў краіны Усходняй Еўропы, закончылі вайну поўным разгромам вермахта на тэрыторыі самой Германіі.

8 мая 1945 года ў прыгарадзе Берліна Карлхорсце быў падпісаны Акт аб безагаворачнай капітуляцыі ўзброеных сіл фашысцкай Германіі.

Пасля разгрому ворага ў раёне Берліна савецкія войскі паспяхова ажыццявілі Пражскую аперацыю, 9 мая ўступілі ў Прагу, прынеслі вызваленне народам Чэхаславакіі.

9 мая стаў Днём Перамогі, вялікім святам савецкага народа і ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва.

У выніку атрыманай перамогі Савецкія Узброеныя Сілы не толькі абаранілі сацыялістычныя заваёвы савецкага народа, але і пазбавілі чалавецтва ад пагрозы фашысцкага рабства, аказалі дапамогу многім народам Еўропы ў вызваленні ад фашызму.

Вайна была самым цяжкім выпрабаваннем для Савецкай краіны. Яна забрала больш за 20 млн. жыццяў, што склала 40 працэнтаў усіх людскіх страт у другой сусветнай вайне. Больш за 3 млн. сваіх воінаў Савецкія Узброеныя Сілы страцілі пры вызваленні народаў Еўропы і Азіі. Фашысцкія захопнікі нанеслі вялікі ўрон народнай гаспадарцы нашай краіны, ператварылі ў руіны тысячы гарадоў, пасёлкаў, вёсак.

Рашаючую ролю ў пераможным заканчэнні другой сусветнай вайны адыграў народ Савецкага Саюза і яго Узброеныя Сілы. На савецка-германскім фронце былі разгромлены і ўзяты ў палон асноўныя сілы фашысцкага блоку — 607 дывізій, у той час як саюзнікі за ўвесь час вайны разграмілі і ўзялі ў палон 176 дывізій.

Перамога СССР у Вялікай Айчыннай вайне паказала вялікую перавагу сацыялістычнага грамадскага ладу. За подзвігі на франтах 11 603 савецкія воіны былі ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза. Ордэнамі і медалямі ўзнагароджана больш за 7 млн. чалавек. Савецкія людзі праявілі масавы гераізм не толькі на фронце, але і ў тыле. Гэта быў подзвіг, роўнага якому яшчэ не ведала гісторыя чалавецтва.

Вялікую дапамогу воінам Чырвонай Арміі аказалі савецкія партызаны і падпольшчыкі. У цяжкіх умовах фашысцкага тэрору яны праявілі глыбокую адданасць Камуністычнай партыі і сацыялістычнай Айчыне.

Актыўны ўдзел у барацьбе з ворагам прымалі выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты універсітэта. Ужо ў першы дзень вайны партыйная і камсамольская арганізацыі БДУ аб'явілі сябе мабілізаванымі для адпору ворага. Многія выкладчыкі і студэнты за мужнасць і адвагу, праяўленыя на франтах Вялікай Айчыннай вайны, узнагароджаны ордэнамі і медалямі. Свяшчэнная памяць аб тых, хто загінуў у барацьбе, неўміруча.

Вайна пераканаўча паказала, што віноўнікам агрэсіі з'яўляецца імперыялізм, і з усёй вастрынёй паставіла пытанне аб тым, каб не дапусціць развязвання новай, яшчэ больш крывавай сусветнай вайны, забяспечыць мір ва ўсім свеце.

«Супраць вайны патрэбна змагацца, пакуль яна не пачалася,— адзначаецца ў пастанове ЦК КПСС «Аб 40-годдзі Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.».— Каб адстаяць мір, неабходны згуртаваныя антываенныя дзеянні ўсіх міралюбівых сіл супраць агрэсіўнага авантурыстычнага курса імперыялізму. Неабходна павышаць пільнасць народаў, берагчы і памнажаць заваёвы сацыялізму».

Вынікі мінулай вайны — суровае папярэджанне цяперашнім падпальшчыкам вайны. Гэтыя вынікі — пераканаўчае сведчанне таго, што спробы імперыялізму з дапамогай ваеннай сілы вырашыць на сваю карысць гістарычную спрэчку з сацыялізмам асуджаны на правал.

**І. МАРЧАНКА,**
**старшыня савета ветэранаў універсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт.**

***СЛОВА — СТАРШЫНІ САВЕТА ВЕТЭРАНАЎ УНІВЕРСІТЭТА***

# ГІСТАРЫЧНЫ УРОК

**НАПЯРЭДАДНІ вялікага свята — 40-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.— Цэнтральны Камітэт КПСС, Савецкі ўрад, высока ацаніўшы подзвіг воінаў на фронце, партызан, падпольшчыкаў, працаўнікоў тылу, прынялі пастанову аб узнагароджанні ветэранаў вайны юбілейнымі медалямі. У парткоме універсітэта адбылося ўзнагароджанне ветэранаў — выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта. Іх запрасілі на сустрэчу, каб яшчэ раз выказаць прызнанне за ўклад у скарбонку Перамогі, за плённую працу ў пасляваенныя гады.**

# КРАІНУ ЗАСЛАНІЎШЫЯ САБОЙ

УЖО 18 ГАДОЎ арганізацыю ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны БДУ імя У. І. Леніна ўзначальвае член партыйнага камітэта, дацэнт І. В. Марчанка, студэнт даваеннага часу. 45 гадоў ён звязаны з універсітэтам, аддае сябе без астатку грамадскай рабоце. А ў гады суровых выпрабаванняў ён з гонарам выконваў свой грамадзянскі абавязак.

У ліку тых, хто ўдастоены вышэйшай узнагароды дзяржавы — ордэна Леніна — Ф. Ф. Церашонак, М. Ц. Нічыпарэнка, М. М. Калінін.

З першага і да апошняга дня вайны, камандуючы гвардзейскімі мінамётнымі часцямі, добрасумленна выконваў свой воінскі доўг Фама Фаміч. Ён удзельнічаў у абароне Масквы, у разгроме варожай групіроўкі ў раёне Сталінграда. У саставе войск 1-га і 4-га Украінскіх франтоў вызваляў ад гітлераўскіх захопнікаў Украіну, Польшчу, Чэхаславакію.

Ветэран Камуністычнай партыі, Ф. Ф. Церашонак за баявыя заслугі ўзнагароджаны ордэнам Леніна і ордэнамі Чырвонага Сцяга, Кутузава і Багдана Хмяльніцкага II ступені.

З першых і да апошніх дзён вайны знаходзіўся ў дзеючай арміі намеснік старшыні савета ветэранаў універсітэта М. М. Шарый. Ён удзельнічаў у Сталінградскай бітве, узяцці Будапешта і Вены, у вызваленні Чэхаславакіі.

У жорсткіх баях за Сталінград актыўны ўдзел прымаў Т. А. Воднеў. Шмат сіл аддае рабоце старшыня камітэта ДТСААФ БДУ, ветэран Вялікай Айчыннай вайны М. В. Гарлатаў.

Адважных жанчын, якія бясстрашна змагаліся з ворагам у саставе камуністычнага падполля і партызанскіх атрадаў, у савеце ветэранаў прадстаўляе дацэнт Л. Л. Кароткая. Былая студэнтка, якая стала настаўніцай напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны, па закліку свайго сэрца адразу стала ў рады змагароў супраць гітлераўскіх захопнікаў.

Актыўна змагаўся ў саставе войск Ленінградскага фронта Б. А. Сяргунін — старшыня секцыі ветэранаў вайны хімічнага факультэта.

У калектыве універсітэта працуе восем кавалераў ордэна Славы III ступені. Адным з тых, хто ўдастоены гэтай высокай салдацкай узнагароды, з'яўляецца дацэнт, кандыдат геаграфічных навук У. У. Стэцко.

**Ветэраны... Вы і сёння ў страі. Вы і сёння прыклад у працы і жыцці... Подзвіг ваш будзе жыць у вяках.**

**Прысутныя накіроўваюцца да мемарыяльнага Знака студэнтам і супрацоўнікам універсітэта, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, каб ускласці гірлянду кветак, каб выказаць сваю вялікую ўдзячнасць за сённяшні светлы дзень тым, хто да яго не дажыў.**

**А. ПАДАЛКА.**



**На здымку: ветэраны вайны з моладдзю універсітэта каля мемарыяльнага Знака студэнтам і супрацоўнікам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай.**

**Фота А. ВАЛОШЫНА.**

## 1945·1985

## БАЙЦЫ ЎСПАМІНАЮЦЬ

# 40

### ЛЕНІНСКАЙ ПАРТЫІ СЫН

# ПА СЛЯДАХ ЛІСТОЎКІ

**У адной з экспазіцый Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны змешчаны партрэт камуніста Героя Савецкага Саюза Д. П. Жмуроўскага. Тут жа франтавая лістоўка, прысвечаная ратным подзвігам мужнага абаронцы Савецкай Радзімы.**

Я ДАЎНО ведаю Дзмітрыя Пятровіча Жмуроўскага. Наша першая сустрэча адбылася ў канцы сорак трэцяга пры фарсіраванні Дняпра. У саставе 254-й Чаркаскай ордэна Леніна, Чырванасцяжнай, ордэнаў Суворава, Кутузава і Багдана Хмяльніцкага стралковай дывізіі мы прайшлі многія сотні кіламетраў па франтавых дарогах. Мне давялося назіраць за баявымі дзеяннямі кулямётчыка сяржанта Жмуроўскага, **дзіўся ў вёсцы Барысавічы, на рэчцы Сож. З ліпеня 1941 года на фронце. Фарсіраваў многія вялікія і малыя водныя перашкоды. «Пераступіў» Днепр, Буг і Днестр, а зараз чакае жорсткая барацьба з ворагам за Прут. Апошнія два гады ўзначальваў кулямётны разлік. А цяпер выконвае абавязкі камандзіра ўзвода.**

Хутка зрабіўшы плыт з падручных сродкаў, Жмуроўскі з дзевяццю салдатамі адплыў ад берага. У яго каманды два станкавыя і два ручныя кулямёты, аўтаматы, гранаты.

Калі воіны ўжо набліжаліся да супрацьлеглага берага, немцы ўбачылі іх і адкрылі агонь.

У жорсткай сутычцы, якая завязалася з ворагам, Дзмітрый дакладнай чаргой знішчыў разлік варожага кулямёта. А яго байцы вывелі са строю дзве нямецкія гарматы.

Бой не заціхаў увесь дзень. Сяржант Жмуроўскі і яго падначаленыя знішчылі каля пяцідзесяці гітлераўцаў.

Але фашысты насядалі. А калі яны падышлі зусім блізка, Жмуроўскі адкрыў па іх агонь з кулямёта. У цяжкіх умовах воіны ўтрымалі захоплены плацдарм да падыходу падмацавання.

Прыклад беззапаветнай мужнасці праявіў Дзмітрый і ў ходзе далейшых баёў за расшырэнне плацдарма. На досвітку наступнага дня ён у ліку першых фарсіраваў нешырокую, але глыбокую рэчку Жыжла і ўварваўся ў занятую праціўнікам вёску Кырпіцы. Разам з радавымі Васілём Фясенкам і Міхаілам Рудэнкам пранік да дома, дзе знаходзіліся фашысты. Пачаў страляць па іх з трафейнага кулямёта. Фясенка і Рудэнка пачалі закідваць гітлераўцаў гранатамі.

На дапамогу Жмуроўскаму і яго двум таварышам паспяшаліся рота Канько і іншыя падраздзяленні. Хуткім ударам выбілі ворагаў з населенага пункта.

**Прыбыўшы камандзір 254 стралковай дывізіі палкоўнік Міхаіл Канстанцінавіч Пуцейка, ураджэнец вёскі Рэўкуцьевічы Мінскага раёна, шчыра дзякаваў Дзмітрыю за мужнасць і адвагу. Абдымаючы сяржанта, сказаў:**

**— Я назіраў за вашымі дзеяннямі па захопу і расшырэнню плацдарма, а таксама ў ходзе бою за вёску Кырпіцы. Вы паказалі сапраўдны гераізм. Дзякуй вам за гэта!**

**Камдыў сказаў, што пра такіх людзей, як сяржант Жмуроўскі, павінны ведаць усе нашы воіны.**

**— Пра яго подзвігі патрэбна напісаць артыкул у газету і падрыхтаваць лістоўку.**

На другі дзень асабісты састаў чытаў у газеце «За Советскую Родину» заметку пра мужнага кулямётчыка. А затым у падраздзяленні паступіла лістоўка, прысвечаная сяржанту Жмуроўскаму. Пасля некаторай дапрацоўкі лістоўка была выпушчана Галоўным палітычным упраўленнем. Яе змест падрабязна даецца ў кнізе «Героі і подзвігі», выпушчанай Інстытутам гісторыі Акадэміі навук СССР у 1958 годзе.

**І ў наступных баях Жмуроўскі паказваў узоры мужнасці і адвагі. Разам са сваёй ротай ён уварваўся на вышыню з замкам памешчыка Разнавану і манастыром. Гітлераўцы пачалі прадпрымаць адчайныя спробы выбіць нашы падраздзяленні з вышыні, адкінуць іх за Прут. Над пазіцыямі паявіліся варожыя самалёты, праціўнік узмацніў артылерыйскі і мінамётны агонь. Затым увёў у бой танкі і пяхоту.**

Склалася крытычная сітуацыя. Сяржант Жмуроўскі падпусціў гітлераўцаў на блізкую адлегласць і амаль ва ўпор пачаў іх расстрэльваць. Затым гранатамі адбіваўся ад насядаўшых фашыстаў.

**У ходзе бою капітан Аулаў атрымаў цяжкае раненне. Салдаты, якія знаходзіліся з ім, былі забіты. А фашысты паўкальцом ахапілі акоп, у якім знаходзіўся сцякаючы крывёю камбат.**

**На выручку афіцэру кінуўся Жмуроўскі са сваім кулямётчыкам — другім нумарам разліку. Агнём з кулямёта і аўтаматаў яны адагналі гітлераўцаў. Прабраліся на НП у акоп. Асцярожна паклалі раненага капітана Аулава на плашчпалатку, вынеслі яго ў бяспечнае месца.**

І зноў бai. Вораг стараўся любой цаной прасунуцца наперад. За дзень кулямётчыкі і іншыя воіны адбілі каля дваццаці варожых атак. Перад іх пазіцыямі зямля ўся была зрыта снарадамі і мінамі.

У баях на подступах да Ясаў Жмуроўскі атрымаў чацвёртае цяжкае раненне і быў накіраваны ў шпіталь.

Пасля выздараўлення мужнаму абаронцу заваёў Кастрычніка Д. П. Жмуроўскаму ў Крамлі быў уручаны ордэн Леніна і Залатая Зорка Героя Савецкага Саюза.

Дэмабілізаваўшыся з арміі, член КПСС Жмуроўскі працягваў перапыненую вайной вучобу ў інстытуце. Зараз ён — доктар гістарычных навук, прафесар БДУ імя У. І. Леніна.

**Д. ПІСЛЯКОЎ,**
**былы ваенны карэспандэнт газеты «За Советскую Родину», палкоўнік запасу.**

Сёння хачу расказаць пра гісторыю з'яўлення лістоўкі, якая вось ужо многія гады знаходзіцца ў музеі.

Было гэта 26 сакавіка 1944 года. Праследуючы адступаючага ворага, 936-ы стралковы полк, які ўваходзіў у састаў дывізіі, выйшаў да дзяржаўнай граніцы. Наперадзе — мнагаводная, бурная рака Прут. Нялёгка будзе пераадолець водную перашкоду, якая разлілася ў вясенняе разводдзе. А пачынаць фарсіраванне патрэбна тэрмінова.

Сяржант Жмуроўскі разам з камандзірам батальёна капітанам В. Аулавым і камандзірам кулямётнай роты малодшым лейтэнантам І. Канько па вузкіх вуліцах малдаўскай вёскі Скуляны прабіраецца да ракі.

Ісці цяжка. Ногі ўсё глыбей топяцца ў цягучую гразь. Па твары б'юць ледзяныя струмені дажджу са снегам, які ідзе вось ужо другія суткі.

Па сігналу камбата людзі, якія ішлі за ім, спыніліся. За некалькі крокаў ад іх гудзе і пеніцца рака, над якой час ад часу ўзлятаюць ракеты. У няяркім святле бачны шматлікія ільдзіны з рванымі бакамі.

— Тут будзем перапраўляцца цераз Прут,— ціха сказаў Аулаў.

Прыбыўшы ў батальён камандзір палка Г. Караленка зацвердзіў рашэнне камбата. Загадаў фарміраваць каманду на першы плыт. Уключаць у яе толькі добраахвотнікаў.

— Дазвольце мне ўзначаліць каманду,— звярнуўся сяржант Жмуроўскі да камандзіра палка.

**Караленка ведаў, што лепшай кандыдатуры, напэўна, і не падабраць. Дзмітрый нара**

# НА НАС ГЛЯДЗЕЛА РАДЗІМА

...У ПАЧАТКУ студзеня 1945 года на І Украінскім фронце пасля паспяхова праведзеных Львоўскай і Сандамірскай аперацый выдаліся кароткія хвіліны цішыні. Войскі фронта праводзілі перагрупіроўку, рыхталіся да новых баёў. Праціўнік таксама часу не губляў — умацоўваў сваю абарону, падцягваў баявую тэхніку, сканцэнтроўваў жывую сілу. А вось лётчыкі баявых часцей не ведалі перадышак. Мы пастаянна вялі паветраную разведку, кантралявалі камунікацыі праціўніка, знішчалі ўсё, што рухалася да фронта і ад яго. Так, у адзін цудоўны студзеньскі дзень (было сонечна і ясна) майму звяну ў саставе Васіля Сурына і Івана Чачэрынды была пастаўлена баявая задача: перыядычнымі палётамі ўздоўж чыгункі Кросна — Бохня — Кракаў (баявыя дзеянні праходзілі на тэрыторыі Польшчы) кантраляваць рух варожых войск і пры іх выяўленні знішчаць. Такі спосаб баявых дзеянняў лётчыкаў называюць «вольным паляваннем». Знаходзячыся ў паветры недзе паміж станцыяй Бохня і Кракавам, я заўважыў па дымку паравоза эшалон, які ішоў у бок лініі фронта з падмацаваннем. Тут жа па радыё аб гэтым паведаміў таварышам. Яны адказалі, што назіраюць за ім і рыхтуюцца да атакі. Аднак атакаваць эшалон у тым месцы, дзе ён быў заўважаны, не мела сэнсу. Эшалон ішоў праз лес, а гэта было добрым прыкрыццём нямецкіх салдат. Нам жа хацелася нанесці ворагу найбольш моцны ўдар. Ацаніўшы абстаноўку, я даў каманду: «З атакай пачакаем, дадзім эшалону магчымасць выйсці на адкрытае месца. Тады і ўдарым». Прайшоў час, і эшалон выйшаў у адкрытае поле. «Вось цяпер і будзем атакаваць,— сказаў па радыё. — Я б'ю па паравозу, вы — па вагонах. Уперад!» Першым снарадам, выпушчаным мною, паравоз быў збіты з рэльсаў, а наступныя снарады былі скінуты на эшалон і на немцаў, якія разбягаліся ў розныя бакі, ад чаго белае поле стала шэрым. У некалькіх месцах эшалон загарэўся, пачалі ўзрывацца вагоны. Заход за заходам, справа і злева мы абрушвалі на ворагаў мора агню...

Я ўзнавіў у сваёй памяці толькі адзін эпізод будзённай работы лётчыкаў баявой часці, у якой служыў і выконваў свой патрыятычны абавязак па абароне любімай Радзімы. А колькі такіх палётаў было за ўсю вайну! І далёка не кожны з іх заканчваўся для нас так паспяхова. У баявым палёце, пра які толькі што расказаў, мы панеслі страту. На падыходзе да аэрадрома групу нечакана атакавалі варожыя знішчальнікі. У гэтай схватцы з ворагам быў смяротна паранены адзін з членаў нашага экіпажа.

Ва ўрачыстыя дні святкавання Вялікай Перамогі вельмі выразна ўяўляюцца мне мае баявыя сябры: капітан Марынкін, лейтэнант Віктар Марозаў, які, будучы смяротна паранены, накіраваў свой самалёт на варожую пераправу, паўтарыўшы бессмяротны подзвіг Гастэлы, старшы лейтэнант Мікалай Круглікаў, Павел Леанідаў, Анатоль Сомаў, Іван Іванькоўскі. Успамінаю лётчыкаў Труценя, Солахава, Зуева, Мезенцава, Савельева, якія не дажылі да светлага Дня Перамогі, і тых, хто і сёння самаадданна служыць Радзіме працай. Няхай іх гераічны подзвіг яшчэ раз напомніць нам, якой вялікай цаной была заваявана Перамога над ворагам.

**М. ЗАЙЦАЎ,**
**дацэнт, Герой Савецкага Саюза.**

**НА ЗДЫМКУ: баявы састаў лётчыкаў 996-га штурмавога авіяпалка. На пярэднім плане М. ЗАЙЦАЎ (злева). Чэрвень 1944 года, І Украінскі фронт. (Здымак з архіва аўтара).**



# ЗА ШЧАСЦЕ, СВАБОДУ, УЗЛЁТ НАШ АРЛІНЫ

## ЧАТЫРЫ ІМГНЕННІ



ПЕРШЫЯ ДНІ вайны старшы лейтэнант Я. А. Піскуноў сустрэў на заходняй граніцы Беларусі. З цяжкімі баямі адступалі часці Чырвонай Арміі.

**— На ўсё жыццё запомніў я твары жанчын і старых,— успамінае Я. А. Піскуноў.— І не было іншага пытання ў іх вачах, акрамя гэтага: «На каго вы нас пакідаеце?» «Мы вернемся»,— гаварылі салдаты. І вярнуліся з Перамогай, прайшоўшы ўсе цяжкасці ваенных дарог.**

Ад першага да апошняга дня быў Ягор Андрэевіч у баявым страі. Дзень Перамогі сустрэў у Празе. Адышлі ў мінулае тыя гады, сталі гісторыяй, але вайна засталася ранай у сэрцы гэтага чалавека на ўсё жыццё.

...Артылерыйскаму дывізіёну старшага лейтэнанта Піскунова было загадана прыкрываць пераправу савецкіх войск цераз Бярэзіну. Яны павінны былі пераправіцца апошнімі, калі асноўныя сілы будуць на тым беразе ракі. Вораг наступаў з усіх бакоў, з паветра бамбіла нямецкая авіяцыя. Адзін са снарадаў трапіў у мост. Перапраўляліся ўброд пад моцным агнём нямецкай артылерыі.

**— Успамінаю тыя дні і не перастаю здзіўляцца мужнасці і гераізму нашых салдат. Так, вораг быў мацнейшы, але мацней за ўсё была наша любоў да Радзімы.**

...У чэрвені 1942 года пры выхадзе з акружэння войскі сустрэліся з курскімі партызанамі. Па рацыі звязаліся з Масквой. Адтуль паступіў загад назначыць капітана Піскунова начальнікам разведкі аб'яднаных партызанскіх атрадаў вобласці.

...У напрамку Льгова неабходна было ўзарваць чыгуначны мост і частку палатна. Ноччу партызаны і спецыяльная група сапёраў падышлі да чыгуначнага насыпу, пачалі закладваць міны. Раптам пачулі гул цягніка. Сталі дзейнічаць хутчэй. Але немцы заўважылі партызан і пачалі страляць. У гэты час з супрацьлеглага боку рухаўся яшчэ адзін нямецкі эшалон. Пачуўшы страляніну, спыніўся. Пад агнявым шквалам партызаны ўзарвалі частку палатна і адышлі. А страляніна працягвалася да самай раніцы, пакуль немцы не разабраліся, хто ёсць хто.

...У лістападзе 1942 года немцы пачалі рашучыя дзеянні супраць партызан. Напярэдадні свята Вялікага Кастрычніка дывізія карнікаў акружыла партызанскі лагер. Тут былі таксама жанчыны, дзеці, старыя. Бой працягваўся да ночы. З прыходам цемнаты партызаны рашылі выходзіць з акружэння. Невялікая група імітавала прарыў, пачаўшы моцную страляніну. У гэтае месца карнікі сцягнулі ўсе сілы, а партызаны хутка вывелі людзей з другога боку.

Увесь наступны дзень фашысты штурмавалі пусты лагер, а потым у сваіх газетах распісалі «грандыёзную аперацыю па знішчэнню трохтысячнага партызанскага атрада».

...Баі ішлі на нямецкай зямлі. Вораг, шалёна абараняючыся, чапляўся за кожны лясок, кожны ўзгорак, але вымушаны быў адступаць пад магутным націскам савецкіх войск.

Быў атрыманы загад фарсіраваць Одэр і замацавацца на другім беразе. Салдаты жартавалі: «Одэр — гэта два Дняпры, а пасярэдзіне Прыпяць». Нялёгка давялося артылерыстам, але ступілі яны на той бераг у ліку першых. Галоўным было ўтрымаць заваяваны плацдарм, даць магчымасць падысці галоўным сілам.

Больш за суткі адбівалі артылерысты пад камандаваннем Я. А. Піскунова атакі ворага і не адступілі ні на крок. За гэты бой Ягор Андрэевіч быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга...

Чатыры кароткія эпізоды з баявога жыцця Ягора Андрэевіча Піскунова, чатыры імгненні вайны. З іх і многіх тысяч іншых складвалася гераічная эпапея Вялікай Перамогі.

**А. ЯКУБЕЦ,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**



## ЧАС ЮНАЦТВА НЕ ВЫБІРАЮЦЬ



МІКАЛАЙ ЦЯРЭНЦЬЕВІЧ Нечыпарэнка ішоў дарогамі Перамогі доўгія чатыры ваенныя гады. Пачынаў лейтэнантам, выпускніком Харкаўскага артылерыйскага супрацьтанкавага вучылішча. Закончыў у Берліне, маёрам, кавалерам пяці ордэнаў, сярод іх — ордэн Леніна.

Сёння Мікалай Цярэнцьевіч, былы начальнік штаба артылерыйскага палка, палкоўнік у адстаўцы — супрацоўнік механіка-матэматычнага факультэта.

— Сярод баявых узнагарод адной з самых дарагіх Вы называеце ордэн Айчыннай вайны першай ступені. Чаму іменна гэту ўзнагароду?

**— Яго я атрымаў за вызваленне беларускіх гарадоў Бабруйска і Брэста. Сам я ўкраінец, але Беларусь для мяне стала роднай. На гэтай зямлі я атрымаў першае баявое хрышчэнне ў 1941 годзе. Першы бой за мястэчка Сураж на Заходняй Дзвіне запомніўся на ўсе чатыры гады вайны. Ды і на ўсё жыццё. Я камандаваў узводам. З пяці гадзін раніцы да сямі вечара наш стралковы полк адбіваў атакі фашыстаў. Гэтага бою мы чакалі з першых дзён вайны, калі пакідалі Украіну, затым, адступаючы па беларускай зямлі. І мы помсцілі, знішчаючы варожыя танкі пад градам куль, снарадаў, мін. Было велізарнае жаданне перамагчы, наступаць, а мы адступілі. Вось чаму пачуццё віны перад беларускім народам не пакідала мяне да 1944 года.**

Пасля першага бою лейтэнант Нечыпарэнка запісаў у сваім франтавым дзённіку: «Мама, я ўжо ў баі. Зямлю Беларусі абараняю. Не ведаю, ці дажыву да перамогі, ці змыю з сябе парахавы пыл. Не хачу большай узнагароды. Мне б толькі ўбачыцца з табою. Толькі б вярнуцца пераможцам...»

І ён вярнуўся. У 1944 годзе вызваляў Беларусь, двойчы быў паранены. Першы раз пад станцыяй Шацілкі, а другі — у баі, аб якім расказваюць сціслыя радкі ваеннага загаду аб узнагароджанні ордэнам Айчыннай вайны І ступені: «...левы бераг ракі Свіслач у раёне Лапічаў і Яльцоўкі. Знаходзячыся на батарэях, т. Нечыпарэнка асабіста ўдзельнічаў у адбіцці трох контратак пяхоты і танкаў праціўніка. Паказваючы асабісты прыклад салдатам і афіцэрам, Нечыпарэнка быў паранены, але поле бою не пакінуў».

Дзень Перамогі Мікалай Цярэнцьевіч сустрэў у Берліне.

**— Я ніколі не лічыў сябе героем. А ўзнагароды Радзімы атрымаў за выкананне свайго грамадзянскага абавязку. З гэтым звязана і мужнасць. Мужным чалавек не нараджаецца, а становіцца. Я лічу, што бамаўцы, байцы студэнцкіх атрадаў, будаўнікі газапровода Урэнгой — Памары — Ужгарад таксама героі, толькі мірных дзён. На трэцім паверсе галоўнага корпуса універсітэта вісіць Дошка гонару. На ёй фотаздымкі студэнтаў юрфака, узнагароджаных ордэнамі Чырвонай Зоркі: Смірнова, Кнігі і Дзямяшкевіча. Я, ветэран, ганаруся імі — героямі сённяшняга дня.**

**В. ШАЎЛЮК,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**



**«ДЗЕ б ні знаходзіўся савецкі чалавек: на фронце, у тыле краіны, у тыле ворага, у фашысцкіх лагерах — усюды ён рабіў усё, што ад яго залежала, каб наблізіць час Перамогі. І нікому не ўдасца паменшыць значэнне ваеннага і працоўнага подзвігу савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне».**

**Г. К. ЖУКАЎ.**

## А ВАЙНА ЗАСТАЛАСЯ Ў СЭРЦЫ

**НА ГАНАРОВАЙ дошцы сярод партрэтаў ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны — супрацоўнікаў факультэта радыёфізікі і электронікі — ёсць фотаздымак загадчыка кафедры фізічнай электронікі Антона Антонавіча Лабуды. «Са студзеня 1944—радавы 39-й арміі 3-га Беларускага фронта. За ўдзел у штурме і ўзяцці Кёнігсберга ўзнагароджаны ордэнам Славы III ступені»,— гаворыць подпіс пад здымкам.**

**МЫ СУСТРЭЛІСЯ з А. А. Лабудам на кафедры, у дзень, калі Антон Антонавіч быў свабодны ад заняткаў са студэнтамі. Свой расказ ён пачаў з успамінаў аб падзеях, якія адбываліся сорак гадоў назад.**

— У красавіку — маі 1945 года наша 221-я стралковая дывізія ў саставе 39-й арміі ваявала ва Усходняй Прусіі. Гэта быў другі, заключны этап баявых дзеянняў. У студзені — лютым мы атрымалі шэраг значных перамог па ўсёй лініі наступлення і ліквідавалі некалькі гітлераўскіх групіровак. Каб канчаткова разбіць ворага, неабходна было знішчыць апошні ўмацаваны плацдарм пад Кёнігсбергам.

Пачаўся завяршальны этап Усходне-Прускай аперацыі. Прыціснутыя да мора, нямецкія войскі апынуліся ў бязвыхадным становішчы, але аказвалі яшчэ даволі моцнае супраціўленне. У той жа час нямецкае камандаванне рыхтавалася да контрудару па савецкіх войсках на паўвостраве. Але самыя гарачыя баі разгарнуліся пад Кёнігсбергам.

Вясновае бездарожжа, непралазная гразь, несупынныя дажджы затрымлівалі рух нашай артылерыі і танкаў. Нягледзячы на цяжкія ўмовы, савецкія войскі ўпэўнена наступалі. Праз сорак восем сутак нам удалося ліквідаваць вялікую групіроўку фашыстаў у Хельсберскім раёне, захапіць шмат баявой тэхнікі і каля 50 тысяч палонных.

Нарэшце шостага красавіка мы прыступілі да непасрэднай асады Кёнігсберга. Гарнізон крэпасці нёс вялікія страты, але адбіваўся яшчэ злосна і ўпарта, не згаджаючыся на капітуляцыю. Толькі 9 красавіка, спалоханы рашучымі дзеяннямі нашай авіяцыі, камендант даў загад аб здачы.

Гэта былі памятныя дні. Кожны ўспамінае тыя ці іншыя баі такімі, якімі сам іх бачыў. А зараз, калі тыя дні адышлі ў мінулае, усё асэнсоўваецца глыбей. Вельмі цікава знаёміцца з ваеннымі мемуарамі нашых камандзіраў і супастаўляць тое, што мы бачылі са сваіх акопаў, з іх маштабнымі планамі і разлікамі.

**— У чым была Ваша роля як палкавога разведчыка?**

— Заданні палкавой разведкі заўсёды былі надзвычай адказнымі. Мы павінны былі сачыць за абаронай ворага, знаходзіць і браць пад прыцэл яго агнявыя пункты. Ад дакладнасці нашых звестак залежаў поспех артылерыі ў час бою. Часта даводзілася браць «языка», каб даведацца аб размяшчэнні нямецкіх часцей і падраздзяленняў. Нават калі яго інфармацыя здавалася супярэчлівай, мы маглі скласці карціну аб сапраўдным становішчы, супастаўляючы словы «языка» з данымі авіяразведкі.

І яшчэ,— дадае Антон Антонавіч,— вы, напэўна, думаеце, што разведка — гэта чорныя цені ўночы і нягучныя выбухі пісталетаў. Вось на Халхін-Голе ў жніўні сорак пятага мы хадзілі ў разведку пад пякучым сонцам па бяскрайняй, бязлюднай пустыні. Здаецца, ніякай небяспекі не было, але хто ведае, пад якім кустом хаваецца вораг?

**— Раскажыце, калі ласка, якім Вам запомніўся Дзень Перамогі?**

— Дзевятага мая я прачнуўся на досвітку ад неверагоднай пальбы. Пушкі, кулямёты, аўтаматы стралялі з усіх бакоў. Спалохаўшыся, і я схапіў аўтамат. Што такое? Што здарылася? А тут мне кажуць: «Перамога! Перамога!». Якая гэта была радасць! Вайна ўжо скончылася. Ну, а далей...



**Потым Антон Антонавіч Лабуда ваяваў з японскімі мілітарыстамі. Пасля дэмабілізацыі вучыўся. Спачатку ў Пружанскім педвучылішчы, потым — у Мінску, на фізмаце БДУ імя У. І. Леніна. І ўсё яго далейшае жыццё і навуковая дзейнасць былі непасрэдна звязаны з нашым універсітэтам.**

**— Вас, ветэранаў, часта просяць расказаць пра вайну. Спачатку ўнукі: «Дзед, а колькі ты фашыстаў забіў?» А потым...**

— Так, пытаюць многа,— гаворыць Антон Антонавіч.— Але ніхто з нас асабліва не любіць пра гэта ўспамінаць, нялёгкі гэта расказ. І калі мяне пытаюць: «Ну як гэта было?» — я толькі смяюся: «Ну так, звычайна. Бац — і няма фрыца» — «А калі сур'ёзна?» — «А сур'ёзна раскажу другі раз».

**Любяць і паважаюць А. А. Лабуду студэнты і супрацоўнікі факультэта радыёфізікі і электронікі. І няма на зямлі прафесіі больш мірнай, чым выхоўваць маладое пакаленне. А вайна? Вайна на ўсё жыццё засталася ў памяці ветэрана. Вайна — гэта вечная рана, якой ніколі не зажыць у сэрцах тых, хто вынес яе цяжар на сваіх плячах.**

**Э. ОЛІНА,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

# ПРЫМІЦЕ ПАДЗЯКУ, САЛДАТЫ АЙЧЫНЫ!



## БАЯВЫ ТАЛІСМАН

ГЭТЫ ЧАЛАВЕК — двойчы ветэран. Яго ведаюць і як выдатнага вучонага-фізіка, заслужанага дзеяча навукі БССР, і як героя-падпольшчыка і ўдзельніка партызанскага руху ў Беларусі. Любяць і шануюць студэнты прафесара Ілью Рыгоравіча Некрашэвіча. Ён увасабляе для іх жывую гісторыю. Ён быў не толькі яе сведкам, але і творцам. Адзін з заснавальнікаў кафедры эксперыментальнай фізікі фізмата БДУ, ён узначальваў яе пачынаючы з 1937 года на працягу сарака пяці гадоў. Ён з тых, хто аднаўляў пасля вайны разбураны універсітэт, вяртаў да жыцця лабараторыі, тэхніку, працягваў даследаванні, пачатыя раней.

Шмат цікавага могуць расказаць пра Ілью Рыгоравіча студэнты-радыёфізікі. Не аднойчы мне даводзілася чуць пра тое, як Некрашэвіч у вайну выконваў заданні падпольнай групы М. Осіпавай: расклейваў лістоўкі, збіраў звесткі аб месцазнаходжанні нямецкіх складаў і вайсковых часцей, здабываў карты і дакументы, дапамагаў мінскаму камуністычнаму падполлю.

Але цікавей за ўсё было паслухаць яго ўласны расказ. Больш таго, мне пашанцавала даведацца аб адной маленькай, але дарагой для Ільі Рыгоравіча рэчы — баявым талісмане.

...Група Марыі Осіпавай аб'ядноўвала каля 40 чалавек. Яна мела добрую канспірацыю, падтрымлівала пастаянную сувязь з партызанскімі атрадамі Лагойскага, Пухавіцкага і Рудзенскага раёнаў. Па загаду Марыі Барысаўны восенню 1941 года Некрашэвіч уладкаваўся на работу ў метэаралагічны інстытут і такім чынам атрымаў доступ да важных стратэгічных дакументаў і карт. Акрамя таго, яму дазвалялася пакідаць Мінск і наведваць прыгарады, тым больш, што ў Ільі Рыгоравіча была для гэтага важная падстава — яго жонка Ганна Мікалаеўна Шымановіч працавала ў медыцынскім пункце ў вёсцы Аляксееўка.

Ходзячы да яе ў «госці», ён прыносіў медыкаменты для групы, збіраў неабходныя звесткі аб руху нямецкіх цягнікоў (куды і што яны вязуць). Вельмі карыснымі былі радыёдэталі, якія Ілья Рыгоравіч даставаў у метэаралагічным інстытуце: ён сам сабраў не адзін прыёмнік. Час ад часу Некрашэвіч хадзіў да разбуранага будынка фізмата і адшукваў там розныя прылады.

Аднойчы ён сустрэў там свайго былога калегу Дзмітрыя Ерамеевіча Сіроціна. «Глядзі, што я знайшоў»,— пахваліўся той і паказаў маленечкі, са звычайны гузік, прадмет. Некрашэвіч паглядзеў і здзівіўся: гэта быў радый. Калісьці, у 1925 годзе, фізіка-тэхнічны інстытут, які размяшчаўся побач, купіў 5 міліграмаў брамістага радыю для сваіх даследаванняў.

«Схавай яго,— сказаў Сіроцін.— Я веру, што ты застанешся жывы».

З таго дня і хаваў Ілья Рыгоравіч талісман. Ён загарнуў радый у фальгу, паклаў у кішэню пінжака і заўсёды насіў з сабой, дзе б ён ні быў.

...Ноччу з 21 на 22 верасня 1943 года Алена Мазанік і Марыя Осіпава арганізавалі замах на гаўляйтэра Вільгельма Кубэ. Аперацыя прайшла паспяхова, але гэта азначала, што ўсёй групе неабходна было тэрмінова пакінуць горад. Жанчын



у тую ж ноч пераправілі ў Маскву, усе астатнія накіраваліся да партызан II Мінскай брыгады. Пайшоў у атрад і Некрашэвіч, не забыўшы разам з дакументамі ўзяць з сабой кавалачак радыю.

Потым былі партызанскія зямлянкі, начлегі ля вогнішча, баявыя выхады.

— Калі мы хадзілі на заданне,— расказвае І. Р. Некрашэвіч,— я хаваў свой талісман у старым пні. Ці мала што магло са мною здарыцца?

Сорак трэці год быў надзвычай цяжкім для партызан. Налёты, рэйды карнікаў, блакады былі пастаяннымі. Яны вымушалі партызан перабірацца на новыя месцы, пераадольваць бясконцыя кіламетры лясоў і балот, ратуючыся ад небяспекі.

— Не ведалі мы тады,— працягвае Ілья Рыгоравіч,— будзем жыць заўтра ці не. І ўсё ж адчувалі сябе лепш, чым у акупіраваным Мінску.

Перамогу адчулі летам 1944 года, калі замест адступаючых гітлераўцаў сустрэлі танкі з чырвонымі зоркамі. Радасці не было канца...

Праз некалькі месяцаў Ілья Рыгоравіч вярнуўся ў вызваленую сталіцу і пачаў працаваць на аднаўленні універсітэта. А баявы талісман? Ён быў цэлы і па-ранейшаму ляжаў у кішэні пінжака...

**О. ЭЛІНА,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**



## ЛЁС УНІВЕРСІТЭТА — МОЙ ЛЁС

МАРЫЮ ПАРФІР'ЕЎНУ БАРАНАВУ часцей за ўсё можна ўбачыць сярод юнакоў і дзяўчат. І тады яе твар свеціцца цеплынёй і радасцю. Радасцю за маладое пакаленне. Успамінае Марыя Парфір'еўна сваё юнацтва.

...У сорак першым яна закончыла чацвёрты курс гістарычнага факультэта БДУ і разам са сваёй групай праходзіла вытворчую практыку ў Ленінградзе, марыла аб рабоце па спецыяльнасці. Як і ўсе студэнты, думала аб размеркаванні. Але... пачалася Вялікая Айчынная вайна.

Потым была эвакуацыя ў Гарынскі раён Свярдлоўскай вобласці. Марыя Парфір'еўна працавала там настаўніцай, завучам, а потым і дырэктарам сярэдняй школы. Даводзілася нялёгка, але кожны імкнуўся зрабіць усё магчымае, каб наблізіць радасны Дзень Перамогі. На ўроках гісторыі вучні знаёміліся з подзвігамі воінаў на франтах Вялікай Айчыннай. Разам са сваёй настаўніцай піянеры і камсамольцы адпраўлялі на фронт пасылкі, перапісваліся з воінамі 3-й Гвардзейскай Панфілаўскай дывізіі.

Марыя Парфір'еўна памятае сваіх вучняў, якія пасля школы пайшлі ваяваць. Тыя юнакі слалі ёй душэўныя лісты, а Юра Мікрукоў пісаў цудоўныя вершы. А вайна не шкадавала нікога. Загінулі многія з выхаванцаў Марыі Парфір'еўны.

М. П. Баранава не раз звярталася з просьбай накіраваць яе на фронт, але лічылі, што ў школе яна будзе больш патрэбнай, ды і не толькі ў школе. Марыя Парфір'еўна была членам Гарынскага райкома камсамола, актыўным прапагандыстам. Акрамя таго, працавала рэдактарам раённага радыё. Два разы на тыдзень вяла перадачы, паведамляла аб подзвігах савецкіх салдат.

Восенню 1943 года ў цэнтральным друку паявіліся звесткі, што на станцыі Сходня пад Масквой аднаўляе сваю работу Беларускі дзяржаўны універсітэт. Гэта было радаснае паведамленне.

...З пятага курса засталося толькі 7 чалавек. Усе яны імкнуліся атрымаць грунтоўныя веды, каб прынесці карысць Радзіме і народу. Заняткі праводзіліся ў будынку мясцовай школы, а жылі ўсе ў дачных хатках летняга тыпу. У тых цяжкіх умовах трое выпускнікоў, у тым ліку і М. П. Баранава, атрымалі дыпломы з адзнакай. У суровы ваенны час студэнты падтрымлівалі сувязь са сваімі аднакурснікамі — франтавікамі А. І. Сідарэнкам, Л. С. Абецэдарскім, А. І. Ляўко.

Вялікая Айчынная вайна прайшла праз сэрца Марыі Парфір'еўны і засталася ў памяці на ўсё жыццё. Загінуў пры вызваленні Гомельшчыны дзевятнаццацігадовы брат. Нядоўга пражыў пасля вайны муж — летчык-штурман Іван Максімавіч Баранаў.

Амаль чатыры дзесяцігоддзі працуе на гістарычным факультэце М. П. Баранава. Універсітэт для яе стаў другім домам.

**І. НОВІКАВА,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**



## ПАДПОЛЛЕ ДЗЕЙНІЧАЕ

МЫ ПРЫВЫКЛІ бачыць галоўную плошчу Мінска — плошчу Леніна — велічнай і прыгожай. А Павел Мікіціч Хмялеўскі памятае яе ў час вайны. Вакол руіны, толькі праёмамі вокнаў зіяюць задымленыя каробкі будынкаў. У вочы кідаўся толькі адзін дом... У ім гітлераўскія каты замучылі многіх патрыётаў. Тут катавалі і яго, члена падпольнага камітэта «Смерць фашызму» Дзяржынскага раёна.

— Ты не хочаш гаварыць — павесім,— злосна свістаў бізун са свінцовымі шарыкамі на канцах раменьчыкаў. І так амаль месяц...

Але вытрымаў Хмялеўскі. Вытрымалі і яго таварышы Ніна Коцешава і Аляксандр Нікіцін. Дзяржынскае падполле жыло.

...Павел Мікіціч Хмялеўскі быў студэнтам педінстытута. Перад самай вайной захварэў і пасля аперацыі прыехаў дамоў у Дзяржынск. Тут сустрэў вестку аб фашысцкай навале. Адразу прыехаў у Мінскі ваенкамат. Папрасіўся на фронт. Сказалі чакаць павестку.

...Неяк зайшоў да Хмялеўскага Генадзь Васільевіч Будай. Яны з Паўлам былі школьнымі таварышамі. У абодвух было моцнае жаданне змагацца. Дзяржынск — невялікі гарадок, усе на вачах. Фашысты могуць вывезці ў Германію, калі не будзеш працаваць. Таму згаварыліся ўладкавацца ў арцелі «Штампаўшчык». Тут сярод людзей лягчэй стварыць падполле.

У жніўні 1941 года ў кабінеце дырэктара арцелі Пятра Драблёна адбылася своеасаблівая нарада. Акрамя Хмялеўскага, Будая, братоў Драблёнаў, прысутнічаў Іван Аляксеевіч Жукавец. Распрацавалі план работы: устанавіць пастаянныя кантакты з мінскімі таварышамі, наладзіць сувязі з надзейнымі людзьмі ў горадзе і навакольных вёсках, пачаць збіраць зброю для будучага партызанскага атрада, знайсці радыёпрыёмнік і пішучую машынку. І арцельная група пачала дзейнічаць. Дзя-



куючы агітацыі групы колькасць падпольшчыкаў расла.

У канцы жніўня на кватэры Хмялеўскага (гэта было зручна: бацька Мікіта Нікіфаравіч Хмялеўскі быў фельчарам, і да яго прыходзіла шмат пацыентаў) адбылося пасяджэнне. Тут стварылі падпольны камітэт «Смерць фашызму». У яго ўвайшлі І. А. Жукавец, Г. В. Будай, П. М. Хмялеўскі. Камітэт наладзіў сувязь з мінскім падполлем, актыўным членам якога быў Уладзімір Сцяпанавіч Амельянюк. І калі Будай разам з Хмялеўскім завіталі да Амельянюка, той не здзівіўся. Добра ведаў ён свайго сябра Генадзя Будая — разам вучыліся ў КІЖы, а Паўла Хмялеўскага па сумеснай рабоце ў Дзяржынскай школе.

Мінскія падпольшчыкі выслухалі расказ Хмялеўскага і Будая аб тым, што ў Дзяржынскім раёне 15 падпольных груп.

— А аб арганізацыі партызанскага атрада вы не задумваліся?— спытаў кіраўнік камароўскай падпольнай групы С. І. Заяц.— Ваеннымі спецыялістамі мы дапаможам.

У сакавіку 1942 года ў Дзяржынскім раёне быў створаны першы партызанскі атрад.

Вясной 1942 года фашысты актывізавалі адпраўку моладзі ў Германію. Павел Мікіціч Хмялеўскі ведаў, што на вуліцы Першамайскай, у школе, будзе працаваць ўрачэбная камісія. У яе ўваходзіць свой чалавек — Ганна Іванаўна Леус, з якой патрэбна наладзіць сувязь.

Пры аглядзе Г. І. Леус старалася знайсці як мага больш хвароб у кожнага. Але ж вымушана была прызнаць частку і здаровымі. Тады ноччу падпольшчыкі адкрылі дзверы і выпусцілі юнакоў і дзяўчат.

А потым пачаліся арышты — знайшоўся здраднік. 8 кастрычніка 1942 года Павел Мікіціч Хмялеўскі быў арыштаваны і кінуты ў турму ў Мінску. Пачаліся допыты. Падпольшчыкі добра ведалі Паўла Хмялеўскага і лічылі сваім абавязкам вырваць яго з рук фашысцкіх катаў. Для гэтага ў Мінск былі накіраваны падпольшчыкі М. Л. Давыдовіч, І. П. Агейчык. Яны ўстанавілі сувязь з наглядчыкам турмы. Ён і дапамог Хмялеўскаму ўцячы. Праз некалькі дзён Павел Мікіціч дабраўся да партызанскага атрада. Пазней стаў камісарам атрада «Бальшавік». Ішла партызанская вайна...

**Л. ТРАФІМОВІЧ,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**




«АБ адным прашу тых, хто перажыве гэты час: не забудзьце! Цярпліва збірайце звесткі пра тых, хто загінуў за сябе і за вас. Няхай жа загінуўшыя ў баі будуць заўсёды блізкія вам, як сябры, як родныя, як вы самі».

Ю. ФУЧЫК.

РАШЭННЕ аб правядзенні аперацыі «Пагаворым, таварыш ветэран!» было прынята на справаздачна-выбарнай камсамольскай канферэнцыі БДУ імя У. І. Леніна. Мэта яе — не пакінуць без увагі ніводнага ветэрана, навечна занесці ў Кнігу памяці імёны пераможцаў. Камсамольцы актыўна ўключыліся ў аперацыю. На хімічным, механіка-матэматычным, фізічным і іншых факультэтах прайшлі сустрэчы з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны. У гэтыя перадсвяточныя дні віншаванні са Святам Перамогі ад студэнтаў універсітэта атрымалі 8 тысяч ветэранаў.

Аперацыя «Пагаворым, таварыш ветэран!» працягваецца. А сёння аб яе першых выніках гавораць камсамольскія актывісты універсітэта, тыя, хто прымае ў ёй самы актыўны ўдзел.

## ПАГАВОРЫМ, ТАВАРЫШ ВЕТЭРАН!

# ЖЫВЕ СЛАВА МУЖНЫХ

**АЛЯКСАНДР БУМБЛІС**, адказны за ваенна-патрыятычнае выхаванне ў камітэце камсамола хімічнага факультэта:

— Наш факультэт уключыўся ў аперацыю «Пагаворым, таварыш ветэран!» у ліку першых. Мы ўзялі шэфства над 505 ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны.

Камітэт камсамола факультэта распрацаваў план правядзення аперацыі. Кожны студэнт атрымаў камсамольскае даручэнне—наведаць ветэрана, пагаварыць з ім, аказаць неабходную дапамогу, запісаць успаміны. Яны даюць нам магчымасць глыбей адчуць веліч і значнасць подзвігу народа. «Кніга народнай славы» на факультэце — яркае сведчанне ўдзелу камсамольцаў у аперацыі. Сюды заносяцца імёны ветэранаў, над якімі ўзялі шэфства камсамольцы факультэта, тут вядзецца запіс іх успамінаў.

**АЛА ШЫНКАРОВА**, студэнтка III курса хімфака, член камітэта камсамола:

— Фёдар Іванавіч Кузняцоў аказаўся чалавекам вясёлым, гаваркім. І калі даведаўся, што я прыйшла ў чым-небудзь дапамагчы яму, шчыра падзякаваў. Усміхнуўшыся, паказаў на дзяцей і ўнукаў: «Памочнікаў у мяне хапае. А вось пагаварыць, падзяліцца сваімі планамі, поспехамі ў вучобе часта заходзяць да мяне. Моладзь я люблю, бо і сам калісьці быў такім жа маладым». І я заходжу да свайго новага знаёмага. Фёдар Іванавіч любіць расказваць пра сваю сям'ю, пра шчаслівае пасляваеннае жыццё. Часта ўспамінае і гады свайго ваеннага юнацтва. За яго плячыма — цяжкае і складанае жыццё. Іменна ў такіх людзей, як Фёдар Іванавіч Кузняцоў, мы вучымся мужнасці, стойкасці.

**АЛЕНА БАСЦЯНКОВА**, студэнтка II курса механіка-матэматычнага факультэта:

— Знаёмствам з Аляксандрам Васільевічам Кірсанавым я таксама абавязана аперацыі «Пагаворым, таварыш ветэран. Я чытала пра подзвігі Аляксандра Васільевіча ў нашай насценгазеце, расказвалі мне пра гэтага чалавека і члены групы «Пошук», што працуе на факультэце. Але гэта былі толькі завочныя знаёмствы, а вось сустрэчы, размовы з гэтым чалавекам не было. Зараз я і мае сяброўкі кожны тыдзень бываем у Аляксандра Васільевіча. Ён добра ведае, разумее студэнцкую моладзь. Аляксандр Васільевіч—чалавек гераічнага лёсу. І хоць былы воін не любіць успамінаць ваенныя гады, яго біяграфія варта таго, каб яе расказвалі маладому пакаленню. З першых і да апошніх дзён вайны А. В. Кірсанаў змагаўся на розных франтах. Ён узнагароджаны чатырма ордэнамі Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Леніна. А за фарсіраванне Дняпра Аляксандру Васільевічу Кірсанаву прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

**АЛЯКСАНДР МАЛЯРЭВІЧ**, намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта па ідэалагічнай рабоце:

— Аперацыя «Пагаворым, таварыш ветэран!» працягваецца. У ёй прымаюць удзел тысячы юнакоў і дзяўчат нашага універсітэта. Новыя сустрэчы з былымі воінамі, адкрытыя камсамольскія сходы, гутаркі — усё гэта дапаможа загартаваць наш характар, выхоўваць ў моладзі пачуццё патрыятызму, самаадданага служэння Радзіме.

Н. ТРУБЧЫК,
студэнтка факультэта журналістыкі.

## БАЙЦЫ УСПАМІНАЮЦЬ
# ФРАНТАВІЧКІ

...ЯК ЦЯПЕР памятаю поўдзень 22 чэрвеня 1941 года. Усе савецкія людзі былі каля рэпрадуктараў — перадавалася ўрадавая заява. Краіна даведалася аб вераломным нападзе фашысцкай Германіі на нашу Айчыну.

Мы, курсанты Мелітопальскага авіяцыйнага вучылішча, як і ўсе савецкія людзі, сэрцам прынялі заклікі Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада: «Да зброі!», «Наша справа справядлівая, вораг будзе разбіты, перамога будзе за намі!». Савецкія людзі прама з заводаў, фабрык, навучальных установ ішлі на фронт. Барацьба з фашызмам для ўсяго народа стала свяшчэнным абавязкам.

На сталах мабілізацыйных пунктаў паявілася шмат заяў з просьбай аб адпраўцы на фронт. Іх пісалі людзі розных узростаў. Сярод стосаў заяў было многа, напісаных рукамі дзяўчат. Пра іх Юлія Друніна пісала:

Всё шли и шли они<br>
Из средней школы,<br>
С филфака,<br>
Из МЭИ и МАИ,<br>
Цвет юности,<br>
Элита комсомола<br>
Тургеневские девушки мои!

Такія «тургеневские девушки» былі і ў нашым 452-м ордэна Багдана Хмяльніцкага Будапешцкім авіяпалку. Сярод іх майстар авіяцыйных прылад Люба Гаджый, матарыстка Зінаіда Чарапанава, майстры па ўзбраенню Елізавета Мезіна, Еўдакія Вараб'ёва, Валянціна Малыгіна і многія іншыя.

Люба Гаджый і Зінаіда Чарапанава ўцяклі з дому, каб толькі трапіць на фронт.

— Як нам было цяжка расставацца з бацькамі,— успамінала Люба Гаджый,— але Радзіма даражэй за ўсё. Памятаю, як мы трапілі пад бамбёжку, убачылі забітых і знявечаных людзей. Зіна пачала плакаць, але нічога не магло ўтрымаць нас.

Пасля заканчэння школы малодшых спецыялістаў Люба Гаджый, Зінаіда Чарапанава і другія дзяўчаты прыбылі да нас у авіяполк. Яны рабілі ўсё, што было ў іх сілах, каб самалёты ў любы момант былі гатовы да вылетаў. Пасля кожнага баявога вылету Люба ўважліва аглядала прыладныя дошкі самалётаў свайго звяна, часта працавала па 12—14 гадзін у суткі, рамантуючы пашкоджаныя прылады. Не памятаю ніводнага выпадку, каб авіяпрылады самалётаў нашага звяна адмаўлялі. Мы, лётчыкі, звярнулі ўвагу на тое, што Люба часта ў першую чаргу падбягала да самалёта, на якім лятаў лейтэнант Сарока. Заўсёды цікавілася, як выканана баявое заданне, ці ўсё добра. Потым мы заўважылі, што яны кахаюць адзін аднаго. Мы былі рады за сваіх баявых сяброў.

Памятаю бой за Будапешт. Наша авіяцыя граміла Будапешцкі ўмацаваны раён. Зінаіда Чарапанава і яе сяброўкі ў холад, сцюжу рамантавалі маторы, ліквідоўвалі пашкоджанні, якія былі зроблены фашысцкай зенітнай артылерыяй або нямецкімі знішчальнікамі. Пальцы прымярзалі да металу, вецер пранізваў наскрозь, але Зінаіда і яе сяброўкі днём і ноччу былі на сваім пасту. Незвычайную мужнасць і стойкасць праяўлялі яны.

Прыкладам у выкананні свайго вайсковага абавязку была стралок-радыст Ася Пашчанка. У баявых вылетах яна ўмела адбівала атакі фашысцкіх знішчальнікаў, выдатна трымала радыёсувязь, лётчыкі прывыклі да яе голасу ў паветры. 25 красавіка 1945 года была цёплая раніца, спявалі салаўі. Хутка адзін за другім падымаліся ў паветра самалёты нашай эскадрыллі, якую вёў капітан Анатоль Іванавіч Спірыдонаў. Цэль — чыгуначны вузел станцыі Брно, дзе былі сканцэнтраваны войскі і тэхніка ворага. Пры падыходзе да аб'екта мы былі моцна абстраляны агнём зенітнай артылерыі і атакаваны фашысцкімі знішчальнікамі. Але дзякуючы ўмела выкананаму супрацьзенітнаму манеўру, выдатнай зладжанасці эскадрыллі і дакладнаму выхаду на аб'ект заданне было выканана. На жаль, страцілі самалёт, на якім ляцела Ася Пашчанка. Я ўбачыў, што яе машына палае і падае. Хутка пераключыў на навакольную сувязь і пачуў голас Асі: «Дарагія мае, бы...» Яна не паспела сказаць «бывайце». А як Ася марыла дажыць да перамогі. Часта яна гаварыла: «Хутка перамога. Вось даканаем гітлераўскую гадзіну і вернемся да мірнай працы, да вучобы. Якое будзе шчасце...» Але не дажыла да гэтага дня Ася. Загінула наша баявая сяброўка, вызваляючы зямлю брацкай Чэхаславакіі ад фашысцкіх акупантаў.

Мне давялося пабываць у Чэхаславакіі пасля Вялікай Айчыннай вайны. Мы ўсклалі вянкі на магілы тых, хто аддаў сваё жыццё за свабоду і шчасце чэхаславацкага народа. А перад вачыма стаяла Ася Пашчанка, загінуўшыя лётчыкі і штурманы, стралкі-радысты...

Нельга не сказаць некалькі слоў пра Тамару Кузьменка, без старанняў якой немагчымы былі б нашы вылеты. Тамара пасля заканчэння школы повараў пайшла на фронт. Яна была поварам у нашым палку. Здаралася, што дзяўчына суткамі не выходзіла з кухні.

У мінулым годзе, праз сорак гадоў, я сустрэўся з Любай Гаджый-Сарока. Цяпер яна ўжо бабуля. Жыве ў горадзе Фрунзе, гадуе ўнукаў, такая ж ветлівая і ўважлівая. На жаль, некалькі гадоў таму назад не стала нашага баявога сябра Сарокі.

З Вінніцы, дзе праходзіла сустрэча ветэранаў 218-й Яскай Чырванасцяжнай дывізіі, мы з Любай заехалі ў госці да баявога сябра-аднапалчаніна Рыгора Кузьменкі і яго жонкі Тамары Мацвееўны, нашага баявога повара. Якая гэта была сустрэча! Мы не бачыліся амаль сорак гадоў. Колькі было ўспамінаў аб баявых дзеяннях нашай 3-й эскадрыллі, аб сябрах-таварышах, аб тых, хто не дажыў да Перамогі, аб святкаванні 8 Сакавіка ў франтавых умовах. Успаміналі і лютаўска-сакавіцкія дні 1944 года. Тады наш полк знаходзіўся на тэрыторыі Румыніі ў мястэчку Сфынту Анна (Святая Анна). У каменным доме размясціліся лётчыкі і штурманы. Аднойчы, у канцы лютага, каля дома спынілася грузавая машына. Мы хутка размясціліся ў кузаве.

— Якое выдатнае надвор'е! Цёпла, навокал вясна, а ў роднай Беларусі напэўна стаяць марозы ды лютуюць фашысты,— сказаў мой зямляк старшы лейтэнант Мурашка.

Надзвычай моцнага здароўя гэта быў чалавек, заўсёды з вясёлай усмешкай (на жаль, загінуў наш весяльчак). Размову падхапілі другія лётчыкі, пачалі ўспамінаць аб родных, сябрах. І я ўспомніў родную вёску Мачулкі, якая размясцілася непадалёку ад Бабруйска. Перад вачыма паўстала родная школа ў Гарбацэвічах, паплылі думкі аб родных і бацьках, братах і сёстрах: што стала з імі? З пачатку вайны я не атрымаў ніводнага пісьма з Беларусі...

Успаміны перапыніў вадзіцель, следам за якім са штаба выбегла дзяўчына. Нехта дапамог ёй залезці ў кузаў, і яна ўбачыла Анатоля Спірыдонава, радасна ўскрыкнула і хуценька пацалавала яго. Мы як быццам бы не заўважылі гэтага. Усе разумелі, чаму дзяўчына была так абрадавана. У час аднаго з вылетаў самалёт Анатоля Спірыдонава быў падбіты зенітным агнём. Дацягнуць да свайго аэрадрома не ўдалося, і лётчык пасадзіў машыну на суседнім аэрадроме. Тры дні, пакуль рамантавалі самалёт, гэта дзяўчына нічога не ведала пра лёс Анатоля. І якая ж вялікая была яе радасць, калі ён зноў вярнуўся ў сваю часць!

А праз некалькі дзён мы віншавалі нашых выдатных дзяўчат са святам 8 Сакавіка...

Р. БУЛАЦКІ,
прафесар, былы штурман экіпажа 452-га Будапешцкага ордэна Багдана Хмяльніцкага авіяпалка.

## З НАШАЙ ПОШТЫ

# ДА СУСТРЭЧЫ, ФАКУЛЬТЭТ!

НАПЭЎНА, кожнаму з юнакоў у дзяцінстве хацелася стаць салдатам. Марыў аб гэтым і я. Памятаю, з якім зачараваннем глядзеў на форму салдата Савецкай Арміі, які прыходзіў дамоў у кароткатэрміновы водпуск.

Прайшоў час. І зараз сам я — малодшы сяржант Савецкай Арміі, абараняю свяшчэнныя рубяжы нашай Радзімы. Раней салдацкае жыццё здавалася мне рамантычным. І толькі зараз я пераканаўся, што быць салдатам не так лёгка, як я ўяўляў, а куды больш складана.

...Дні, тыдні, месяцы. Хутка ляціць час. Не паспееш азірнуцца, і надыдзе дзень дэмабілізацыі. Я разумею, што шкада будзе пакідаць таварышаў. І ўсё ж чакаю гэтага часу, каб зноў вярнуцца на родны факультэт — на журфак.

Сяргей РУЧАНАЎ,
малодшы сяржант Савецкай Арміі.

САЛЮТ, ФЕСТЫВАЛЬ!

# МЫ — ЗА МІР ЗА ДРУЖБУ!

**СВЯТАМ МІРУ, ДРУЖБЫ, МАЛАДОСЦІ СТАЎ СТУДЭНЦКІ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНЫ ФЕСТЫВАЛЬ, ЯКІ ПРАЙШОЎ ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ Ў ДЗЕНЬ МІЖНАРОДНАЙ САЛІДАРНАСЦІ СТУДЭНТАЎ І БЫЎ ПРЫСВЕЧАНЫ 40-ГОДДЗЮ ПЕРАМОГІ САВЕЦКАГА НАРОДА Ў ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЕ І XII СУСВЕТНАМУ ФЕСТЫВАЛЮ МОЛАДЗІ І СТУДЭНТАЎ У МАСКВЕ.**




КАБ ЯШЧЭ раз заявіць аб сваім імкненні змагацца за адзінства моладзі ўсёй планеты, за шчырую дружбу, мір і шчасце ўсіх народаў. сабраліся юнакі і дзяўчаты універсітэта на гэты фестываль. Ён прадэманстраваў дружбу і адзінства паміж моладдзю розных краін свету ў барацьбе за мір. Актыўны ўдзел у яго арганізацыі прынялі замежныя студэнты. Яны падрыхтавалі выстаўкі аб сваіх краінах, фотаздымкі, кнігі, часопісы, сувеніры, нацыянальнае адзенне і стравы. Вялікай цяжкасцю было адшукаць сярод усіх выставак самую цікавую. Ні на хвіліну не адыходзілі госці і ўдзельнікі фестывалю ад афганскай, кубінскай, в'етнамскай, чэшскай і іншых выставак. Замежныя студэнты не паспявалі адказваць на пытанні, прапаноўваць свае нацыянальныя стравы, расказваць аб сувенірах.

Потым пачало працаваць фотаатэлье. Жадаючых сфатаграфавацца было шмат. У хуткім часе усе яны атрымаюць на памяць аб свяце здымкі з фестывальнай «Кацюшай», шарамі і вясновымі кветкамі.

Атракцыёны, канцэрт мастацкай самадзейнасці, конкурс малюнкаў на асфальце, конкурс палітычных плакатаў... Цікава было паглядзець усё.

Пачынаецца мітынг. Да вялікай сцэны сабраліся ўдзельнікі фестывалю. Адкрыў мітынг сакратар парткома універсітэта М. І. Дзямчук. Запальваецца факел універсітэцкага фестывалю.

На мітынгу выступілі Герой Савецкага Саюза М. Я. Зайцаў, дырэктар Інстытута філасофіі і права АН БССР, удзельнік Маскоўскага і Венскага фестываляў моладзі і студэнтаў Я. М. Бабосаў, студэнт IV курса механіка-матэматычнага факультэта Энрыке Сільва Моліна з Нікарагуа.

Тое, аб чым яны гаварылі, было ў гэты дзень у думках кожнага: зберагчы мір на планеце, не дапусціць ядзернай вайны.

Намеснік сакратара камітэта камсамола Віктар Шадурскі прапанаваў усім разам зачытаць рэзалюцыю мітынгу.

«Мы адзіны ў сваім рашэнні прадухіліць пагрозу ядзернай вайны, адстаяць мір ва ўсім свеце! За антыімперыялістычную салідарнасць, мір і дружбу!» — моцнай хваляй пракацілася над стадыёнам. І вера кожнага ў свае сілы падвоілася. Ён не адзін. Нас многа. Значыць мы зможам атрымаць перамогу над рэакцыйнымі і мілітарысцкімі коламі, якія імкнуцца ўцягнуць чалавецтва ў ядзерную катастрофу.

Прагучала апошняе слова, і ў паветра на шарах падымаюцца транспаранты, над стадыёнам ляцяць галубы — сімвал міру і шчасця. Гучыць Гімн дэмакратычнай моладзі. Мітынг аб'яўляецца закрытым, а фестываль працягваецца. Не ўсё паглядзелі яшчэ госці фестывалю. Пачынаецца канцэрт вакальна-інструментальнага ансамбля, потым — танцавальная праграма, факельнае шэсце да мемарыяльнага Знака загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны студэнтам і супрацоўнікам універсітэта. Да падножжа ўсклалі гірлянду з кветак. Мінутай маўчання ўшанавалі памяць герояў, а потым далі клятву на вернасць традыцыям бацькоў і дзядоў.

Мітынг закончыўся, закрыўся і фестываль. Але гэты дзень яшчэ раз напомніў нам усім, што быць маладым нельмі адказна. Свет сёння перажывае складаны час. Уся прагрэсіўная моладзь павінна ўнесці свой уклад у барацьбу за мір. Урокі мінулай вайны не павінны быць забыты!

**Н. МАРЦІНКЕВІЧ,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**












●

**НА ЗДЫМКАХ:** «Прывітанне ўдзельнікам фестывалю!»; дзеці розных народаў...; голуб міру ў руках у студэнткі факультэта журналістыкі Надзі Джаян (Афганістан); конкурс малюнкаў на асфальце; у час канцэрта; адкрыццё мітынгу.

Фота А. ВАЛОШЫНА.

# РУЖОВЫ РАНАК

ЛІТАРАТУРНАЯ СТАРОНКА

**МІХАСЬ СКОБЛА,**

студэнт філфака

## ЛЯСНАЯ БАЛАДА

*Міхаілу Макаравічу Карнавуху, ваеннаму лётчыку, загінуўшаму ў паветраным баі ваенным летам 44-га.*

I

Блакіт з чорным дымам размешаны.
Прыціх замаркочаны лес.
І першымі ўчулі алешыны:
Зямля скаланулася дзесь.

Дрыжалі лісточкі спалохана,
Не ў час абляцеўшы на дол.
А рэха далёка галёкала
Знявечаным стогнам наўкол.

II

Над лесам — паветраны бой.
Трывожна стаіліся кроны.
А думка, прагнаўшы спакой,
Пранізвала: «Вышлі патроны!»

Майстэрствам не возьмеш адным.
Пагляд патанае ў блакіце.
«Загінуць такім маладым?
Дзе праўда на свеце, скажыце?!»

Машына з натугі дрыжыць,
І цела свінцом налілося.
Надзея калоціцца: «Жыць!..»
Адчай прыглядаецца скоса.

Ды рантам знямеў рухавік,
І полымя спутала крылы.
Усмешку і зболены крык
Засмяглыя вусны закрылі.

«Спакойна становішча ўзваж.
Забудзь, брат, адчаю прычыну...»
У вогненны кінуў віраж
Ён поўную дыму машыну.

III

Над лесам расцвіў парашут.
«Прашу, супакойся, вятрыска,
Бо й так ужо вёсачка блізка,
Шашы пераціяў яе шнур».

Пустуе маўклівы бальшак.
Вунь злеплена з гліны адрына.
«Зусім як у нас на Украіне»,—
Падумаў — і стома няўзнак.

Так хочацца гэтай вайны
Пазбыцца хаця б на хвілінку.
У рукі ўзяўшы травінку,
Падыхаць спакоем зямным.

Ды раптам дыханне звяло,
Бы звер учапіўся кашлаты:
У чорных мундзірах салдаты
Ад вёскі насустрач... «Палон?!»

Зямля наплывала, як сон,
Захутаны сумнай смугою.
Зямля наплыва тугою,
Бядою і болем... «Палон...»

Збалела адчула далонь
Варожую грань пісталета.
Яшчэ раз ваеннае лета
Пачула: «Лепш смерць, чым палон!»

IV

У лесе празрыстаю раніцай
Жывіцы сасновы настой.
Сюды я прыходжу параіцца,
Даверыць спакою настрой.

Бяроза лагодна прытуліцца,
Пад згоду маўклівую хвой.
Раскажа і слёзна расчуліцца:
«Над лесам — паветраны бой...»

...На могілках ціш не зашыліцца,
Тут смутак вартуе спакой.
Бярозка над помнікам хіліцца —
Дачка прыгажуні лясной.

Пагляду ў дзяцінстве не зводзіла:
«Ці ж зоркі з камення растуць?»
...На сцежках народнага подзвігу
Бяссмертнікі ціха цвітуць.

## ЧОРНЫЯ БУСЛЫ НАД ХАТЫННЮ

Над жыллём, што быллём парасло,
Плача рэха ў лясах пад Лагойскам.
...Кружыць некалькі чорных буслоў
Над знявечанай, спаленай вёскай.

Гэта ім, белым птахам, вайна
Апаліла магутныя крылы
Чорным дымам, што ўзняўся з гумна,
Як агонь на людзей дах абрынуў...

Потым птушкі адсюль паляцяць,
Будуць песціцца ў росах паўднёвых,
Каб ад жахаў вайны акрыяць,
Зноў лунаць у прасторах вясновых.

Толькі колер смяртэльнай жуды
Не развеяць ім ветрам гаючым,
Не знайсці цудадзейнай вады,
Астудзіла каб боль іх пякучы.

Не падняцца ў блакітную плынь,
Бо — навошта там чорныя здані?
І буслы паляцелі ў Хатынь
Нізка-нізка на золкім світанні.

А над роднаю вёскай званы
З болю, слёз льюць вайне адгалоскі.
Быццам свечкі, стаяць каміны
Над магілай загінуўшай вёскі.

Рвецца вецер з галля трох бяроз,
Што стаяць, нахіліўшыся нізка
Прад зямлёй, скамянелай ад слёз,
Прад застыўшым ад гора Камінскім.

Доўгі час сумавалі буслы,
Рвучы крыллем дажджоў павуцінне...
Потым зніклі.
Свой боль паняслі
Да людзей, на балотныя стыні.
Б'юць званы — б'юцца сэрцы Хатыні...

## СМАГА

З-за адкрытых з даверам фіранак
Крэпасць слухала музыку траў.
Ды жалезам пасечаны ранак
На счарнелыя росы апаў.

Папярхнуўшы знічкай гарачай,
Ноч растала ля гаснучых зор.
З Мухаўца недаспелы гарлачык
Выплываў, расстраляны ва ўпор.

А снарадаў стальныя тараны
Білі ў твар цытадэлі старой.
І на сценах глыбокія раны
Набракалі крывавай зарой.

Ды рады абаронцаў радзелі...
У падвале баец малады
Папрасіў, каб яго перадзелі
І далі хоць глыточак вады.

Ён пакутна стагнаў, небарача.
З ранаў ціха сачылася кроў.
І сястра медыцынская плача,
Бо няма ні вады, ні бінтоў.

Да ракі ад фашыстаў употай
Не дапоўз гэтай ноччу баец...
Разрывае ствалы кулямётаў
Звар'яцелы ад смагі свінец.

Перасохлі, ўчарсцвелі байніцы,
Плюючыся апошнім агнём...
Абгарэлай цагліне прысніцца
Шчодры лівень, без выбухаў гром.

Не, не подзвігам трызняць тут людзі,
А крынічкай, што ў травах цякла...
Пыл густы набіваецца ў грудзі,
Смага ссохлыя вусны сцяла.

І трывожна да болю на сэрцы,
І рука прыціскае курок,
І ўставалі яны перад смерцю,
І бяссмерце сустрэла іх крок.

...Над ракой зацвілі вербалозы,
Ды застаўся ў гарлачыках сум.
І сягоння ўдовіны слёзы
Па-над крэпасцю соляць расу,

Што застыла святлом непрыметным
На траве, на лісточках ракіт
І на бронзавых вуснах салдата,
Што і сёння паўзе да ракі.




**СЯРГЕЙ ЧЫГРЫН,**

студэнт філфака.

## ВАСІЛЮ БЫКАВУ

Вайна — гэта знак бяды,
Яе немагчыма забыць.
А мёртвым не трэба вады,
А мёртвым ужо не баліць.
Праз порах
І дым вайны,
Праз пасткі і праз вышыні,
Ішлі батальёна сыны
І воўчую зграю крушылі.
Абеліскі вітаюць зару,
Жураўліныя крыкі ачнуцца...
Праз Альпы ў Беларусь
Пайсці,
дажыць
і вярнуцца.

■ ■ ■

* * *

Вагар часу —
Зямляне,
Ад іх залежыць планета.
На плач, праклён, катаванне
Пара накласці вета.
Наш ідэал —
Свабода,
Што тушыць агонь вайны...
Снарад сорак першага года
Выносіць хлапчук з баразны.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Красная звезда» МВПА імя Я. Коласа.

8 мая 1985 г.
Зак. 2529—2530. АТ 13323.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ